# У складзе Кіеўскай Русі

Распад племянных адносін у славян на зыходзе першага тысячагоддзя нашай эры прывёў да стварэння ва Усходняй Еўропе старарускай дзяржавы з цэнтрам у Кіеве, у склад якой увайшла тэрыторыя Мазыршчыны. Мясцовасць, дзе цяпер знаходзіцца горад і іншыя старажытныя паселішчы — Скрыгалаў, Барбароў, Мялешкавічы, калісьці была заселена ўсходнеславянскім племенем дрыгавічоў. «А друзии седоша межю Припятью и Двиною и нарекшеся дреговичи», — гаворыцца ў «Аповесці мінулых гадоў». У раёне Мазыра на правым беразе Прыпяці і каля іншых мазырскіх вёсак знаходзяцца самыя раннія на беларускім Палессі дрыгавіцкія курганы.

Упамінанне ў летапісе пра пасяленне дрыгавічоў паміж Прыпяццю і Дзвіною дае падставы лічыць, што рассяленне ішло з поўдня на поўнач. Дрыгавіцкі племянны саюз не распаўся і не знік бясследна, а перарос у палітычнае аб'яднанне — Тураўскае княства. Летапісныя і археалагічныя даныя сведчаць аб яго з'яўленні ў канцы X ст. Размяшчэнне Турава ў непасрэднай блізкасці ад Кіева вымушала яго знаходзіцца ў сферы палітычнага прыцяжэння сталіцы старажытнай Русі.

Развіццё вытворчасці ў гэтым рэгіёне, аддзяленне рамёстваў ад сельскай гаспадаркі з'явілася прычынай росту не толькі Турава, а і іншых пасяленняў і пераўтварэння іх у гарады, якія станавіліся цэнтрам рамёстваў і гандлёвай дзейнасці насельніцтва. На месцы ўмацаванага дрыгавіцкага гарадзішча вырас і горад Мазыр, хоць яго насельніцтва доўгі час працягвала займацца сельскай гаспадаркай.

Апрача легендарнай версіі паходжання назвы «Мазыр», якая прыводзілася ўжо ў гэтай кнізе, ёсць і версія навуковая. Як лічаць беларускія даследчыкі В. Жучкевіч і А. Рагалёў, вытокі назвы «Мазыр» можна звязваць з назвай этнаграфічнай групы заходнеславянскага (польскага) насельніцтва — мазуры. Даследаванні апошніх гадоў сведчаць аб этнічных сувязях паміж усходнімі і заходнімі славянамі яшчэ ў VIII – X стст. У XI – XII стст. актывізуюцца гандлёва-эканамічныя, палітычныя і культурныя сувязі заходніх славян з насельніцтвам Беларусі. Мабыць, у гэты час сюды з Захаду і пранікаюць геаграфічныя назвы ад этнічнага тэрміна «мазуры», хоць ён сустракаецца ў пісьмовых крыніцах толькі з XV ст. Адсюль вынікае, што назвы, роднасныя «мазурам», маглі паявіцца на Беларусі не пазней гэтага часу. Мазуры былі адной з найбольш вялікіх этнічных груп Польшчы, рускія князі хадзілі на іх паходамі яшчэ ў XI ст. Тады была вядома толькі назва «мазаўшаны». Кіеўскія дружыны прыводзілі палонных, якія рассяляліся ў ваколіцах Кіеўскага княства. Шлях на мазавецкія землі ішоў па Прыпяці, і мазаўшаны маглі асесці на пастаяннае месца жыхарства на беларускім Палессі.

А. Рагалёў прапануе і яшчэ адно тлумачэнне тапоніма. У іранскіх мовах ёсць слова «мазар», «мосар» ці «мазор» — старажытныя пахаванні, курганы, пагоркі. Мазыр раскінуўся на ўзвышшах сярод балот і багнаў Палескай раўніны, таму назва Мазыра ад слова «мосар» можа тлумачыцца і асаблівасцямі геаграфічнага ландшафту... У той час пасяленні знаходзіліся адно ад аднаго за дзесяткі вёрст і былі ізаляваны працяглы час, асабліва ў паводку. Водныя шляхі дапамаглі абжываць гэты край, немалую ролю ў гэтым адыгрывалі і волакі. Таму А. Рагалёў звяртае ўвагу на тое, што слова «мосар» па сваім гучанні напамінае слова «мосер» ці «мосьер», што ў мове народаў комі азначае «волак», «шлях па водараздзеле», «лагчына».

І яшчэ адна версія. У канцы першага — пачатку другога тысячагоддзя многія гандлёвыя гарады Кіеўскай Ру-

сі ўзбройваліся, запасаліся «ратнымі людзьмі». Магчыма, Мазыр з'яўляўся адным з гандлёвых пунктаў на водным шляху ў старажытнасці «из варяг в греки». Уверх па цячэнні Прыпяці — у раёне вёсак Загорыны і Лучажэвічы, уніз — Акулінкі і Стрэльска знаходзіліся вартавыя пасты, якія абаранялі подступы да горада. Не абышлося тут без варагаў. У X і XI стст. варагі часта прыходзілі на Русь — з гандлёвымі мэтамі ці па закліку рускіх князёў, якія набіралі з іх свае дружыны. «Аповесць мінулых гадоў» называе варагаў жыхарамі Паўночнай Еўропы, што жылі па берагах Варажскага (Балтыйскага) мора. Гэта былі шведы, нарвежцы, датчане, готы, англы. Многія з іх засталіся тут назаўсёды, жаніліся. Дзеці іх былі паўварагамі, унукі — дасканалымі славянамі, але пэўная частка моўнай культуры варагаў перадалася жыхарам Палесся. Словы «масур» — клён і «мосыр» — сырасць — са старажытнаскандынаўскай мовы. Калі вольна інтэрпрэціраваць іх значэнне, паводле В. Жучкевіча, назву горада Мазыр можна перакласці як «горад пад клёнамі» ці «сырое месца».

Першае ўпамінанне аб Мазыры адносіцца да 1155 г. у «Аповесці мінулых гадоў» — Іпацьеўскім летапісе.

Прыпяць, буйнейшы прыток Дняпра, стварала насельніцтву горада спрыяльныя ўмовы для гандлю, рамеснай вытворчасці, рыбнай лоўлі, умацаванню і росту горада. Але ва ўмовах феадальнай раздробленасці, маючы моцных суседзяў — на захадзе Тураў, па паўднёвым усходзе — Кіеў, на ўсходзе — Чарнігаў, Мазыр не мог сфарміравацца як цэнтр самастойнага княства. Тэрыторыя Мазыршчыны стала арэнай пастаянных княжацкіх усобіц. Часта над горадам падымаўся дым ваенных пажарышчаў.

У 1170 г. каля Мазыра адбылася ўзброеная сутычка паміж князямі Рурыкам, Давідам Расціслававічам і Міхаілам Юр'евічам. Першыя два былі саюзнікамі Андрэя Багалюбскага, сына Юрыя Далгарукага, які вёў барацьбу за Ноўгарад з кіеўскім князем Мсціславам Валынскім. Міхаіл Юр'евіч падтрымліваў бок кіеўскага князя, папераменна знаходзіўся ў залежнасці ад варожых, больш моцных княстваў.

З канца XII ст. на Мазыршчыне з'яўляюцца са сваімі дружынамі літоўскія князі. П. М. Шпілеўскі, спасылаючыся на летапіс Нарбута, паведамляе, што ў 1174 г. Мазыр быў захоплены літоўскім князем Скірмундам. «После поражения хана Балаклая Койданова Скирмунд занимает Мозырь, Чернигов, Стародуб, Карачев». Літоўскія феадалы імкнуліся падпарадкаваць землі па сярэднім цячэнні Прыпяці, але ў 20-я гады XIII ст. у іх з'яўляецца сапернік — татара-манголы. Здзяйсняючы волю феадальнай знаці, Чынгісхан, стаўшы ў 1203 г. уладаром манголаў, накіраваў вялікія орды на пакарэнне бліжэйшых народаў, імкнучыся стварыць вялікую дзяржаву, «куды ступіць капыт мангольскага каня». У 1223 г. на рацэ Калцы татара-манголы нанеслі сакрушальны ўдар па сілах палавецкіх ханаў і рускіх князёў і накіраваліся на захад, памятаючы, што там ляжыць багатая, але аслабленая ўзаемнай варожасцю феадалаў зямля. Асабістыя амбіцыі ўдзельных вялікіх і малых правіцеляў трымалі верх над агульнадзяржаўнымі інтарэсамі. І, мабыць, першы з конных атрадаў татара-манголаў з'явіўся пад Мазыром праз чатыры гады пасля бітвы на Калцы. У 1228 г. ён уступіў у бой з дружынай літоўцаў і мазыран, захапіў, разрабаваў і спаліў горад, яго ваколіцы. На працягу больш як дзесяці гадоў пасля гэтага не было чуваць пра заваёўнікаў.

Наступіў 1241 год. Унук Чынгісхана Батый пасля таго, як захапіў і разбурыў Кіеў, накіраваў вялізную арду на захад, у Венгерскую даліну, каб даць адпачынак воінам і забяспечыць корм коням. Адзін з атрадаў пад камандаваннем Койдана і Каюна (пляменніка Батыя) у студзені падышоў да Мазыра. Горад зноў быў разбураны, яму не хутка ўдалося адбудавацца.

Археалагічныя знаходкі канца XIII – пачатку XIV стст. на мазырскім гарадзішчы вельмі рэдкія і фрагментарныя. Відаць, жыццё тут толькі адраджалася. Жыхары, якія засталіся жывымі, напалоханыя жорсткім прыгнётам заваёўнікаў, разышліся і схаваліся ў нетрах палескіх лясоў, у непраходных балотах. Уладанне татара-манголаў на Мазыршчыне было нядоўгім. У 40–50-я гады XII ст., імкнучыся як мага больш сабраць даніны з мясцовага насельніцтва ў міжрэччы Прыпяці і Дняпра, татара-манголы займаліся павальным рабаўніцтвам. У 1259 г. хан Койдан (яго атрад дахоодзіў да Давыд-Гарадка і, мяркуючы па тапоніму Койданава, дасягнуў заходніх рубяжоў Мінска) раскінуў свой стан недалёка ад вусця Прыпяці. Літоўска-беларускія дружыны незаўважна, лясамі падкраліся да ворага, нечакана напалі на яго і знішчылі. Тое ж здарылася і з другімі атрадамі рабаўнікоў. Кароткаму і жорсткаму татара-мангольскаму гаспадаранню на гэтых землях быў пакладзены канец, хаця набегі крымскіх татар працягваліся.

У час мірных передышак Мазыр кожны раз адраджаўся з попелу, адбудоўваўся ўпартай працай яго жыхароў. Да саракавога года XIV ст. Мазыршчына канчаткова ўвайшла ў склад Вялікага княства Літоўскага. На чатыры з паловай стагоддзі Мазыршчына адыходзіць ад рускай дзяржавы, з якой звязаны пачатковы перыяд яе летапіснай гісторыі.

Культура старажытнай Русі, у склад якой у XI – XIII стст. уваходзіў Мазыр, развівалася на аснове традыцый папярэдняга перыяду. Значнае месца ў культурным жыцці народа займала рэлігія. Пасля пераходу ў канцы X ст. ад язычніцтва да хрысціянства афіцыйнай рэлігіяй пануючага класа феадалаў становіцца праваслаўе. З распаўсюджаннем уплыву праваслаўнай царквы звязана і з'яўленне на Русі школ. Першыя школы на Мазыршчыне ствараліся пры цэрквах, а іх з'яўленне адносіцца да часу старажытнай Тураўскай епархіі, якая ўзнікла, як сцвярджае І. Зяленскі, у пачатку XII ст. Але М. Ермаловіч стварэнне епіскапата ў Тураве адносіць да 991–992 гг., г. зн., ён быў адзін з першых на беларускай зямлі. У школах выкладалася чытанне, пісьмо, першапачатковыя догматы рэлігіі на славянскай мове.

Зараджэнне і развіццё культурных і асветніцкіх пачаткаў на Мазыршчыне звязана з імем вядомага пісьменніка, публіцыста і царкоўна-палітычнага дзеяча Кірылы Тураўскага (каля 1130–1182). Нарадзіўся ён у багатай сям'і і атрымаў вельмі добрую для свайго часу адукацыю. Пазней стаў епіскапам Тураўскім. Гэта быў высокаадукаваны чалавек. Ён выступаў супраць рэшткаў язычніцтва, крытыкаваў адмоўныя бакі быту манахаў, звяртаўся да філасофіі, займаўся літаратурай, быў выдатным прамоўцам і вучоным. Кірылам Тураўскім па праву ганарыцца не толькі Палессе, але і ўся беларуская зямля.

Час Кіеўскай Русі на Мазыршчыне быў нялёгкім. Многа разоў горад і навакольныя вёскі знішчаліся заваёўнікамі. Не прынясе асаблівага спакою насельніцтву Палесся і час знаходжання ў складзе Вялікага княства Літоўскага і Польскай дзяржавы, які працягваўся чатыры з паловай стагоддзі. Такая доля насельніцтва, якое жыве сярод іншых, больш шматлікіх народаў.

*А. Бобр*

## Даследчык старажытнай Мазыршчыны

Завітневіч Уладзімір Зянонавіч нарадзіўся 2(14).3.1853 г. у в. Ліцвяны цяпер Уздзенскага раёна Мінскай вобл. У 1878 г. скончыў Пецярбургскую духоўную акадэмію, працаваў настаўнікам у Варшаве, з 1884 г. – у Кіеўскай духоўнай акадэміі. Прафесар. Беларускі археолаг.

Уладзімір Завітневіч асабліва лю-

біў прыязджаць з блізкага адсюль Кіева на Мазыршчыну. У Скрыгалаве жылі яго родзічы. Адзін з іх, Васіль Завітневіч, таксама вялікі патрыёт роднага краю, служыў свяшчэннікам скрыгалаўскай царквы. Вынікам цікавых размоў блізкіх па духу людзей з'явілася тое, што Уладзімір Зянонавіч вырашыў шукаць сляды далёкіх продкаў на поўдні Беларусі.

Нястомны даследчык за свае сродкі арганізаваў некалькі палескіх экспедыцый, выявіў каля 700 курганоў, звыш 80 могільнікаў дрыгавічоў і палян. Толькі ў ваколіцах вёсак Барыскавічы, Лешня, Скрыгалаў, Слабада ў 1889 г. Завітневіч даследаваў больш за 200 старажытных курганоў, на 60 з іх правёў раскопкі. Ён знайшоў пахаванні далёкіх продкаў, шматлікія прадметы, якімі яны карысталіся,— посуд, нажы, крэсівы, жаночыя ўпрыгожанні і іншыя прадметы, што дазволілі зрабіць значныя вывады і адкрыцці ў галіне археалогіі. Вучоны вызначыў межы рассялення дрыгавічоў, іх этнічныя вызначальныя прадметы ў час нараджэння старажытнай дзяржаўнасці ў VIII—XII стст. Даследаваў ён не толькі Мазыршчыну — арганізаваў экспедыцыі і ў іншыя гарады Палесся.

Вынікамі археалагічных даследаванняў У. З. Завітневіча з'явіліся ягоныя кнігі: «У археалагічнай экскурсіі ў Прыпяцкае Палессе» (1890), «Другая археалагічная экскурсія ў Прыпяцкае Палессе» (1891) і іншыя. Матэрыялы даследаванняў і цяпер захоўваюцца ў археалагічных музеях Мінска, Кіева, Масквы.

Памёр У. З. Завітневіч у сакавіку 1927 г.

*М. Капач*

## У складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай

На пачатак XV ст. межы Вялікага княства Літоўскага распасціраліся ад Жмудзі (Жэмайціі — заходняй часткі сучаснай Літвы) і Падляшша на поўначы да прычарнаморскіх стэпаў на поўдні. Пры вялікім князю Вітаўце была захоплена тэрыторыя паміж вусцем Дняпра і Днястра, воіны княства выйшлі да берагоў Чорнага мора.

У складзе Вялікага княства Мазыр працягваў развівацца як гандлёва-рамеснае пасяленне, статус яго — «гаспадарскі горад», што азначае — Мазыр з'яўляўся маёмасцю дзяржавы.

Пастунова паблізу Мазыра ўтвараліся «іншыя вясковыя пасяленні людзей». У дакументах XIII ст. з'явілася першае ўпамінанне аб Скрыгалаве. Каля 1432 г. упершыню ўпамінаюцца і вёскі Міхалкі, Барбароў, Мялешкавічы, у 1515 г.— Прудок.

У 1413 г. на Гродзенскім сейме ў Літве было вырашана стварыць ваяводствы па польскім узоры. Мазыр з ваколіцамі ўвайшоў у склад Мінскага ваяводства, якое падзялялася на тры паветы—Мінскі, Рэчыцкі і Мазырскі.

Мазырскія гандляры ў XV ст. мелі вялікія сувязі, прыпяцкі гандлёвы шлях звязваў іх з Кіевам, Пінскам, Брэстам, а праз гэтыя гарады — з Масковіяй, Польшчай, Прыбалтыкай. Але ўлада вялікага літоўскага князя не магла абараніць горад і навакольныя вёскі ад разбурэнняў, якія адбываліся ў час частых набегаў крымскіх і нагайскіх татар — у 1497, 1521 і нават 1534 гг.

Час быў вельмі нялёгкі, амаль штогод неўраджай, частыя татарскія набегі. Вясною 1498 г. пачаўся голад. Яшчэ больш цяжкім аказаўся апошні набег ворагаў. П. М. Шпілеўскі пісаў: «З першых гадоў улады Сігізмунда I перакопскія татары пачалі трывожыць заходнерускі край Мазыр, адзін з першых гарадоў, які стаў ахвярай заваёўнікаў. Татарскія набегі на Мазыр нарадзілі герояў, сярод якіх народныя песні праслаўляюць храбрасць бясстрашнага Базара, родам з Грэцыі. Базар не раз граміў татараў,